**УДК 392:273.2(476.5)**

# ХРАМАВАЯ АРХІТЭКТУРА СТАРАВЕРАЎ-БЕСПАПОЎЦАЎ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНЫ СТАН

***У.Я. Аўсейчык***
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, г. Наваполацк, Рэспубліка Беларусь
e-mail: u.auseichyk@psu.by

*У рабоце разгледжаны асаблівасці традыцыйнага культавага дойлідства старавераў паўночна-заходняй Беларусі. Прааналізаваны архітэктурна-планіровачныя асаблівасці, выяўлены канстуктыўныя і дэкаратыўныя рысы стараверскіх храмаў рэгіёна. У паўночна-заходнім рэгіёне Беларусі найбольшая колькасць аб'ектаў адносіцца да драўлянай архітэктуры. У рэгіёне існуе толькі адзін мураваны стараверскі храм у г.п. Відзы Браслаўскага р-на.*

***Ключавыя словы:*** *стараверы, паўночна-заходняя Беларусь, архітэктура, культавае дойлідства, драўляныя і мураваныя храмы.*

# ХРАМОВАЯ АРХИТЕКТУРА СТАРОВЕРОВ-БЕСПОПОВЦЕВ СЕВЕРО-ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ: ТРАДИЦИИ И СОВРЕМЕННОЕ ПОЛОЖЕНИЕ

***В.Е. Овсейчик***
Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой,
г. Новополоцк, Республика Беларусь
e-mail: u.auseichyk@psu.by

*В работе рассмотрены особенности традиционного культавого зодчества староверов северо-западно Беларуси. Проанализированы архитектурно-планировочные-особенности, отмечены конструктивные и декоративные черты староверческих храмов регионе. В северо-западном регионе Беларуи наибольшее число объектов относится к деревянной архитектуре. В регионе имеется только один каменный староверческий храм в городском поселке Видзы Браславского района.*

***Ключевые слова:*** *староверы, северо-западная Беларусь, архитектура, культовое зодчество, деревянные и каменные храмы.*

# TEMPLE ARCHITECTURE OF THE OLD BELIEVERS OF NORTHWESTERN BELARUS: TRADITIONS AND CURRENT STATE

***U. Auseichyk***
Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, Navapolatsk, Republic of Belarus
e-mail: u.auseichyk@psu.by

*This paper examines the features of traditional Old Believer religious architecture in northwestern Belarus. Architectural planning features are analyzed, and the structural and decorative characteristics of Old Believer churches in the region are identified. In the northwestern region of Belarus, the largest number of buildings are wooden. There is only one stone Old Believer church in the region, in the urban settlement of Vidzy in the Braslav District.*

***Keywords:*** *Old Believers, northwestern Belarus, architecture, religious buildings, wooden and stone churches.*

Сярод аб’ектаў храмавай архітэктуры старавераў-беспапоўцаў паўночна-заходняй Беларусі вылучаюцца дзве групы: мураваныя храмы і драўляныя. Ніжэй прадстаўлена характарыстыка кожнай з гэтых груп асобна. Нягледзячы на шматлікія адрозненні ў знешнім афармленні і інтэр’еры, храмы беспапоўцаў рэгіёна пры гэтым вельмі блізкія адзін да аднаго. Усё гэта абумоўлена асаблівасцямі веравучэння стараверaў-беспапоўцаў. Так, згодна з хрысціянскай традыцыі храм павінен уяўляць выцягнутую пабудову (“карабель”), якая складаецца з алтара, памяшкання для малення і прытвора. Аднак у беспапоўцаў з-за адсутнасці святарства і немагчымасці праводзіць літургію храмы не мелі алтарнай часткі. Таму комплекс храма мусіць уключаць толькі малітоўны зал і прытвор. Такім чынам храмы стараверaў-беспапоўцаў рэгіёна ў архітэктурным плане вельмі блізкія паміж сабой. У большасці сваёй яны ўяўляюць прамавугольную ў плане пабудову падоўжана-восевай кампазіцыі, якая ўключае два памяшканні (малітоўны зал і прытвор). Усе храмы арыентаваны па лініі «захад – усход» (бываюць з невялікім адхіленнем).

Як ужо было адзначана вышэй, за ўвесь перыяд на тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі зафіксавана значная колькасць старaверскіх храмаў. Іх падлік паказаў, што яны знаходзіліся ў каля 40 населеных пунктах рэгіёна (без уліку выпадкаў пераноса храма адной абшчыны ў іншую вёску). Найбольшая колькасць (30 храмаў) у рэгіёне адначасова функцыянавала ў 1930-я гг. Але ў дадзеным раздзеле не ўсе гэтыя аб’екты будуць разглядацца ў роўнай ступені. Гэта абумоўлена шэрагам прычын. Па-першае значная іх частка ў сучасны перыяд не існуе, а крыніцы па некаторых утрымліваюць вельмі сціслую інфармацыю. Па-другое, шэраг аб’ектаў, якія існуюць у сучасны перыяд, былі пабудаваны толькі ў пачатку 1990-х гг. Некаторыя з іх былі перабудаваны з існуючых жылых ці грамадскіх будынкаў (напрыклад, храмы ў Браславе, аг. Друя Браслаўскага раёна). А таму на фарміраванне іх архітэктурнага аблічча паўплываў характар першапачатковай пабудовы. Пры гэтым, усё ж, трэба заўважыць, што пабудаваныя (ці перабудаваныя з жылых і грамадскіх будынкаў) у другой палове XX – пачатку XXI ст. храмы (г. Браслаў, в. Буеўшчына, аг. Друя) у плaніроўцы і аб’ёме адпавядаюць традыцыям храмабудаўніцтва стараверaў-беспапоўцаў на беларускіх землях.

Найбольшую колькасць старaверскіх беспапоўскіх храмаў уяўляюць аб’екты, пабудаваныя з дрэва. Увогуле, да пачатку XX ст. у беспапоўцаў рэгіёна існавалі толькі драўляныя храмы. І толькі з пачатку XX ст. з’явіліся мураваныя. На вялікі жаль, крыніцы канца XVIII – першай паловы XIX ст. мала паведамляюць аб знешнім выглядзе храмаў стараверaў-беспапоўцаў рэгіёна. Але і з існуючых згадак становіцца зразумела, што старaверскія малітоўныя дамы рэгіёна яшчэ ў першай палове XIX ст. мелі элементы, якія ўказвалі на сакральны статус пабудовы. Да іх, у першую чаргу, адносіліся крыжы і званіцы. Так, старaверскі храм у 1820-я гг. у Відзах характарызаваўся наступным чынам: “В оном городе имеют свои сходбища по часовни на подобие церкви выстроенную с колоколами” [8, ф.136, воп.1, спр.7963, арк.84адв].

На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. храмы стараверaў у архітэктурным плане істотным чынам абмяжоўваліся законам. Было дазволена функцыянаванне толькі храмаў без «оказательства» (без купала, званіцы і крыж, г.зн. без элементаў, якія ўказваюць на культавы характар пабудовы). А таму доўгі час старaверскія храмы знешне не нагадвалі пабудовы культавага характару. У крыніцах гэтага часу пастаянна знаходзім характарыстыку знешніх асаблівасцей старaверскіх маленных з пазнакай, што яны не адрозніваюцца ад сялянскіх хат. Па сведчанні на 1897 г.: па знешняму выгляду, як сведчаць афіцыйныя даныя, малельні стараверaў Віленскай губерні мала адрозніваліся ад простых хат [4, с. 99]. Так, па сведчанні М. Посаха, у Відзах у канцы XIX ст. малельня стараверaў размяшчалася на Угорскай вуліцы, была драўлянай і не адрознівалася ад звычайных пабудоў [5, с. 4–5]. Крыніцы свед-

чаць і пра падабенства да хаты храма ў в. Барсучына (суч. Шаркаўшчынскі раён, не захаваўся) у канцы XIX ст.: “Барсучинская община отделилась от Кублищенской в 1894 году, был построен жилой дом согласно пережитого времени угнетений истиной Христовой церкви” [8, f.1681, ap.1, b.173, l.90]. Аднак некаторыя стараверскія храмы ў заходняй частцы Беларусі і ў гэты перыяд фіксуюцца з “окозательствами”. Так, у 1880-я гг. храмы ў вв. Апідамы і Кукляны (сучасны Пастаўскі раён) згадваюцца са званіцамі і крыжамі.

Закон ад 3 мая 1883 г. хоць і дазваляў на храмах стараверaў усталёўваць наддзверныя іконы і крыжы, але па-ранейшаму не дазваляў іншыя знешнія праявы храма. Менавіта з-за гэтага доўгі час у канцы XIX ст. не ўдавалася атрымаць дазвол вернікам Кублішчанскай абшчыны на будаўніцтва свайго храма. Прадстаўлены праект нагадваў праваслаўную царкву. І толькі пасля ўказу 1905 г. стараверам дазвалялася будаваць свае малельні са знешнімі праявамі храма (з крыжамі, купаламі, званіцай).

Але нягледзячы на тое, што гэты ўказ дазваляў будаваць стараверскія храмы без абмежаванняў у знешнім выглядзе, шэраг з іх па-ранейшаму мала адрозніваліся ад простых хат. Пры гэтым трэба адзначыць, што падабенства шэрагу стараверскіх храмаў рэгіёна да простых хат адзначалася нават у крыніцах міжваеннага перыяду (малюнак 1). Такая сітуацыя была характэрна для Грыгараўшчынскай царквы (не захавалася, сучасны Браслаўскі раён). У 1929 г. абшчына нават хадайнічала перад Вышэйшым стараверскім саветам у Польшчы аб выдзяленні грошай на рамонт храма. У ім якраз і апісвалася падабенства храма да звычайнай хаты. А таму прыхажане адзначалі, што для “отличия от обычных домов, то желательно выстроить купол” [8, f. 1681, ap.1, b.462, l. 51].



**Малюнак 1. – Праект стараверскай маленнай у в. Грыгароўшчына (не захавалася, сучасны Браслаўскі раён)** [**8, f. 1681, ap.1, b.463, l. 45**]

Як вынікае з архіўных матэрыялаў, у міжваенны перыяд Ластавіцкі храм таксама не меў "окозательств". У якасці тлумачэння такога знешняга выгляду вернікі ўказвалі той факт, што храм быў пабудаваны яшчэ ў той час, калі забаранялася будаўніцтва з "окозательствами": "а был построен в виде жилого дома, а потому что русские чиновники нам тормозили, т.е. не давали разрешения строить молитвенные храмы". У 1933 г. прыхажане Ластавіцкай абшчыны звярнуліся ў ВСС з просьбай аб дапамозе ў рамонце свайго храма. Імі меркавалася разам з тым прыбудаваць прытвор, а над ім "компал с крестом", каб храм нагадваў "вид церковный" [8, f. 1681, ap.1, b.29, l. 66, l. 105].

Большасць драўляных храмаў старавераў-беспапоўцаў рэгіёна аднazрубныя. У іх усе часткі аб'яднаны ў адным вялікім прамавугольным зрубе з дапамогай прыёму зрошчвання брусоў у адной плоскасці. Як намі адзначалася, у стараверскіх беспапоўскіх храмах паўночна-заходняй Беларусі няма алтарнай апсіды, таму ўсходняя частка пабудовы заканчваецца глухой сцяной. Некаторыя храмы складаюцца з двух зрубаў (да чатырохсцена далучаны трысцен). Зруб, як правіла, пастаўлены на стужкавы падмурак, складзены з бутавага (радзей часанага) каменю на растворы. Большасць цэркваў зрублены ў "чысты" (нямецкі) вугал. З ацалелых да нашага часу стараверскіх храмаў рэгіёна толькі ў маленных у в. Ластавічы Глыбоцкага раёна і в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна зруб "з астаткам".

Сярод усіх стараверскіх культавых аб'ектаў паўночна-заходняй Беларусі сваёй архітэктонікай вылучаецца драўляная святыня ў в. Стрыпішкі Астравецкага раёна. Храм мае аб'ёмна-прасторавую структуру трохнефавай базілікі з прамавугольным планам (зруб падзяляецца двума радамі калон на тры нефы, сярэдні з якіх вышэйшы і шырэйшы за бакавыя).

Памеры страверскіх храмаў рэгіёна, як правіла, не вялікія. У пераважнай ступені гэта абумоўлена тым фактам, што большасць цэркваў размяшчалася ў сельскай мясцовасці, дзе колькасць вернікаў не была такой вялікай. Як вынікае з аналізу матэрыялаў сярэдзіны XX ст., памеры ацалелых на той час храмаў рэгіёна вагаліся ад 70 $м^2$ да 130 $м^2$. Толькі цэрквы ў в. Кірыліна Браслаўскага раёна (160 $м^2$) і в. Кублішчына Мёрскага раёна (192 $м^2$) вылучаліся сваімі параметрамі [1, ф. 4029, воп. 1, спр. 13, арк. 256–273].

У сучасны перыяд большасць цэркваў мае ашаляваныя дошкамі фасады. Але, як сведчаць архіўныя крыніцы і фотаздымкі, у 1930–1950-х гг. шалёўка на многіх адсутнічала. У пераважнай колькасці храмаў у сучасны перыяд фасады ашаляваны гарызантальна. Толькі некаторыя маюць змешаны варынт. Так, у в. Масцішча Валожынскага раёна ніжні і верхні ярусы фасада ашаляваны вертыкальна, а сярэдні – гарызантальна. У в. Апідамы і в. Кукляны Пастаўскага раёна, в. Кірыліна Браслаўскага раёна толькі ніжні ярус фасада ашаляваны вертыкальна, а астатняя частка – гарызантальна. У большасці храмаў гарызантальна ашаляваныя і франтоны. Выключэнне складаюць храмы ў в. Апідамы, в. Кукляны, в. Кірыліна, в. Ластавічы, в. Стрыпішкі і в. Германавічы. У в. Кірыліна і в. Кукляны франтоны ашаляваны вертыкальна. У в. Ластавічы ніжні ярус галоўнага (заходняга) франтона ашаляваны вертыкальна, а верхні – гарызантальна. в. Апідамы франтоны ашаляваныя ў форме "елачкі". Усходні франтон храма ў Апідамах мае нішу ў форме аркі на ўсю вышыню франтона. Франтоны Варонкаўскага храма таксама былі ашаляваныя ў "елачку". Аднак у сучасны перыяд яго заходні франтон абшыты бляхай. З усіх храмаў паўночна-заходняй Беларусі дэкорам вылучаецца шалёўкай франтонаў храмаў у Стрыпішках (малюнак 2) і Германавічах.

Фасады стараверскіх храмаў вельмі стрыманыя і аскетычныя. Фактычна адзіным дэкаратыўным прыёмам у фарміраванні іх знешняга выгляду з'яўляецца афармленне ліштвамі аконных праёмаў. Часцей у стараверскіх храмах на бакавых фасадах налічваецца тры ці чатыры вокны. У некаторых храмах яшчэ адно невялікае акно размяшчаецца ў заходняй частцы бакавых фасадаў. Яно размяшчаецца вышэй, чым узровень астатніх (для асвятлення хораў). У некаторых храмах вокны былі з аканіцамі (в. Булавішкі, аг. Друя, в. Мінкавічы). У сучасны перыяд наяўнасць аканіц тлумачыцца мерамі бяспекі. У шэрагу храмаў вокны прысутнічаюць

і на галоўным фасадзе. Часцей у такім выпадку два невялікіх акенцы прымыкаюць непасрэдна да дзвярэй (у в. Ластавічы, в. Ніўнікі; у в. Кірыліна толькі 1 акно на галоўным фасадзе з боку ад дзвярэй). У в. Варонка на галоўным фасадзе размешчаны 4 акны ў два ярусы. Невялікае акенца часта размяшчаецца на галоўным (заходнім) франтоне (в. Кірыліна, в. Ніўнікі, в. Германавічы, пас. Свір, в. Варонка). Такое ж акенца было і ў в. Кублішчына, як сведчаць ілюстрацыі 1950-х гг. У храмах в. Апідамы, в. Варонка, в. Ніўнікі, в. Кублішчына невялікае акенца мелася і на ўсходнім франтоне. Акенцы на франтоне маюць часцей прамавугольную форму, радзей прамавугольную з паўцыркульным завяршэннем, круглую ці рамбічную. На ўсходнім фасадзе вокнаў няма, паколькі ў стараверскіх беспапоўскіх цэрквах гэта сцяна глухая і выконвае функцыю іканастаса. І нават у выпадках, калі стараверскі храм быў перабудаваны з жылой хаты, у якой вокны з гэтага боку раней былі, то іх забівалі дошкамі (аг. Друя Браслаўскага раёна).



**Малюнак 2. – Стараверскі храм у в. Стрыпішкі ў 1930-я гг.**

Большасць храмаў рэгіёна накрыта двухсхільным дахам. У шэрагу святынь старавераў паўночна-заходняй Беларусі дах мае залобак, калі ўсходні франтон усечаны зверху невялікім схілам (в. Масцішча Валожынскага раёна, пас. Свір Мядзельскага раёна, в. Кукляны Пастаўскага раёна). Як вынікае з аналізу геаграфічнай спецыфікі формы дахаў стараверскіх храмаў, то яна адпавядае форме даху жылых пабудоў рэгіёнаў.

У сучасны перыяд стрэхі стараверскіх цэркваў пакрыты фальцавай бляхай ці шыферам. Як сведчаць фотаздымкі 1920–1930-х гг. і архіўныя крыніцы, некаторыя храмы старавераў рэгіёна ўжо ў гэты перыяд былі пакрыты бляхай. Значная колькасць таксама мела пакрыццё драўлянымі матэрыяламі (дранкай ці гонтам). Яшчэ ў сярэдзіне ХХ ст. пры рамонце шэраг храмаў пакрывалі гонтам або дранкай. Так, у ходзе рамонту царквы ў пас. Свір, які правялі ў 1954 г., дах пакрылі гонтам [2, ф. 952, воп. 2, спр. 51, арк. 124]. Нават і ў наш час у шэрагу аб’ектаў пад новай кроўляй маецца драўлянае пакрыццё (в. Ластавічы Глыбоцкага раёна, в. Варонка і в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна, в. Апідамы Пастаўскага раёна і інш.).



**Малюнак 3. – Свята-Пакроўскі стараверскі храм у в. Булавішкі Браслаўскага р-на, 1980-я гг. [6, ф. 1439, воп. 6, спр. 54, арк. 28]**

У той жа час у шэрагу храмаў старавераў-беспапоўцаў рэгіёна, як вынікае з аналізу крыніц, яшчэ ў сярэдзіне ХХ ст. мелася саламянае пакрыццё даху. Так, у акце абследавання за 1951 г. храма ў в. Мікалаюнцы Браслаўскага раёна пазначана, што ў ім мелася саламяная страха [1, ф. 1439, воп. 3, спр. 145, арк. 8адв]. У 1950 г. саламяныя стрэхі таксама фіксаваліся ў стараверскіх храмах у вв. Мінкавічы і Астровішкі Браслаўскага раёна, в. Барсучына Шаркаўшчынскага раёна [2, ф. 952, воп. 1, спр.25, арк. 9, арк. 39].

Пасля 1905 г. у храмах старавераў-беспапоўцаў паўночна-заходняй Беларусі найбольш выразнай рысай, а часам і адзінай, якая ўказвае на культавы характар аб’екта, з’яўляецца вежа-званіца. Яна размяшчаецца ў заходняй частцы храма з боку галоўнага фасаду. У стараверскіх храмах рэгіёна званіца прадстаўлена двума варыянтамі: першы – калі яна надбудавана над каньком даху (як бы “вырастае” з яго); другі – калі вежа-званіца прымыкае (прыбудавана) да плоскасці заходняга фасаду. Як сведчаць апісанні і ілюстрацыйныя крыніцы, нават пасля 1905 г. шэраг храмаў старавераў-беспапоўцаў па-ранейшаму званіц не меў. У іх з боку галоўнага (заходняга) фасаду над каньком размяшчаўся васьміканцовы крыж. З ацалелых да нашага часу храмаў вежа-званіца адсутнічае ў маленнай в. Ластавічы Глыбоцкага раёна. Замест яе на каньку ў заходняй частцы храма размешчана глаўка на тонкім барабане.

Іншыя варыянты, калі званіца размяшчалася на аддаленасці ад стараверскага храма, сустракаецца рэдка. Так, у 1937 г., быў скаладзены план участка з храмам у в. Ластавічы. На ім на ўсход ад храма пазначана асобна стаячая зусім невялікая званіца [8, f.1681, ap.1, b.187, l. 34r]. А ў 1934 г. ад Грыгараўшчынскай абшчыны паступіла прашэнне ў ВСС аб дапазе ў будаўніцтве званіцы. У ім адзначалася, што “колокольни не существует уже три года и звоницу имеем на сосновом суку” [8, f.1681, ap.1, b.462, l. 159].

У храмах старавераў-беспапоўцаў паўночна-заходняй Беларусі найбольш пашыраны першы варыянт – з надбудаванай над галоўным фасадам вежай. Як правіла, яна мае адзін ці два ярусы і завяршаецца невялікай глаўкай. Двух’ярусная вежа часцей выканана ў выглядзе

васьмерыка на чацверыку з шатровым завяршэннем і купалком (вв. Варонка і Германавічы Шаркаўшчынскага раёна, вв. Кублішчына і Ніўнікі Міёрскага раёна і інш.). У храме ў пас. Свір Мядзельскага раёна характэрны варыянт "васьмярык на васьмярыку". Сустракаецца варыянт двух'яруснай вежы "чацвярык на чацвярыку" (в. Кукляны Пастаўскага раёна). У некаторых храмах вежа была выканана аднаярусная ў форме чацверыка з шатровым завяршэннем і невялікай глаўкай (в. Стрыпішкі Астравецкага раёна, сучасны выгляд храма ў в. Кірыліна Браслаўскага раёна).

У храмах стараевераў-беспапоўцаў рэгіёна даволі распаўсюджаны таксама і варыянт вежы-званіцы, якая прыбудавана (прымыкае) да плоскасці заходняга фасада. Да гэтай групы адносяцца храмы ў в. Мікалаюнцы Браслаўскага раёна, в. Лучай Пастаўскага раёна (не захаваўся), в. Масцішча Валожынскага раёна, в. Апідамы Пастаўскага раёна і інш. У адным выпадку (в. Булавішкі Браслаўскага раёна; мал. 3) вежа прыбудавана да галоўнага ўвахода, які размяшчаецца не з заходняга боку, а з паўднёвага, у сярэдзіне даўжыні храма. У в. Апідамы і в. Масцішча чацвярык званіцы не проста прымыкае да заходняга фасада, але непасрэдна "ўрэзаны" ў яго канструкцыю.

Вежы-званіцы такога тыпу падзяляюцца на ярусы, або маюць без'ярусную кампазіцыю (іх ярусы знешне не выдзяляюцца). У шэрагу прыкладаў ярусная вежа мае ступеньчатую кампазіцыю (в. Лучай Пастаўскага раёна, суч. выгляд храма ў в. Мікалаюнцы). Кожная са ступенек, як правіла, мае прамавугольны план. У шэрагу храмаў ярусы вежаў былі падкрэслены невялікімі казыркамі-стрэшкамі (суч. выгляд храма ў Мікалаюнцах, в. Булавішкі). Аснова такіх веж-званіц мае прамавугольны план. У храме ў в. Масцішча вежа мае пірамідальную форму (крыху звужаная ўверсе). Вежы-званіцы гэтага тыпу, як правіла завершана чатырохгранным плоскім шатром, над якім узвышаецца глаўка, часцей цыбулепадобнай формы. На верхнім ярусе вежы маюцца праёмы прамавугольнай формы, або з паўкруглым, спічастым ці з трохгранным завяршэннем.



**Малюнак 4. – Маленная стараевераў у Германавічах Шаркаўшчынскага р-на. Фота Аўсейчыка У.Я. у 2023 г.**

У большасці святынь маецца і другая невялікая вежачка, размешчаная над усходняй часткай. Яна, як правіла, аднаярусная ў форме чацверыка ці васьмерыка, з невялікай цыбулепадобнай ці паўкруглай глаўкай. У некаторых храмах меншай вежачкі ва ўсходняй частцы не было (в. Стрыпішкі Астравецкага раёна, в. Кукляны Пастаўскага раёна), або яе замяняў крыж (выгляд храма ў в. Мінкавічы Браслаўскага раёна ў міжваенны перыяд).

Уваход у маленную часцей размяшчаецца з заходняга боку, з боку галоўнага фасада. У в. Булавішкі ўваход размяшчаецца з паўднёвага боку ў сярэдзіне храма (малюнак 3). Тут уся пабудова дзялілася на дзве часткі: адна прызначана для маленнай, а ў другой жыў святар. Уваход у стараверскіх храмах часцей аформлены адкрытым ці паўзакрытым ганкам на слупах-калонах або кансолях з двухсхільным дахам і трохвугольным франтонам (в. Мінкавічы, в. Апідамы, в. Германавічы, в Кублішчына, в. Ніўнікі, в. Ластавічы, в. Стрыпішкі). Храмы ў пас. Свір і в. Кукляны маюць закрытыя ганкі.

Планіроўка драўляных храмаў старавераў-беспапоўцаў паўночна-заходняй Беларусі даволі аднатыпная. Як правіла, яна ўключае два памяшканні, пастаўленыя адно за адным па адной восі: прытвор – заходняя частка і малітоўная зала – усходняя частка. Іх памеры не аднолькавыя (прытвор значна меншы). У прасторы прытвору нярэдка вылучаліся асобныя памяшканні (“келлі”): месца для хрышчэння, келля святара і інш. З прытвора выходзяць адны ці двое дзвярэй (апошні варыянт больш распаўсюджаны і абумоўлены традыцыяй раздзельнага малення мужчын і жанчын), якія вядуць у малітоўную залу. У прытворы таксама размяшчаецца лесвіца на званіцу і хоры (калі яны маюцца). Храмы старавераў-беспапоўцаў паўночнай Беларусі не мелі скляпенняў. У большасці іх падшывалася звычайная плоская столь. У шэрагу выпадкаў у малітоўнай зале яна была скругленай, плаўна пераходзячы ў вертыкальную плоскасць сцен.

Ва ўсіх беспапоўскіх цэрквах адсутнічае алтар. Але паказальна, што ў архіўных апісаннях і на архітэктурных планах усходняя частка храма (прастора клірасаў) нярэдка пазначана як алтар (такі прыклад з планам храма в. Булавішкі, складзеным у другой палове XX ст. [1, ф. 1439, воп. 3, спр. 143, арк. 16]). Паколькі ў храмах старавераў-беспапоўцаў літургію не служаць і сакрамант эўхарыстыі не адбываецца, то алтар адсутнічае. На ўсходняй сцяне маленнай, якая выконвае функцыю іканастаса, размяшчаюцца іконы. Як сведчаць сучасныя натурныя абследаванні і фотаздымкі сярэдзіны XX ст., яны часцей ўстанаўліваюцца на паліцах, размешчаных уздоўж сцяны. Такім чынам, у стараверскіх храмах іканастас закрывае сцяну, але не алтар. Аналіз фотаздымкаў другой паловы XX ст. паказвае, што ў храмах рэгіёна існавала традыцыя накрываць абразы ручнікамі і ўпрыгожваць кветкамі. Але такія звычаі не новыя. Нават упрыгажэнні ікон (а стараверскія храмы рэгіёна вызначаліся аскетызмам) сустракалася і ў міжваенны перыяд. Так, у Відзаўскім храме ў 1930-я гг. мясцовы спеўны гурток “украсил венками «иконостас»” [8, f.1681, ap.1, b.174, l. 18].

Перад іканастасам размяшчаецца салея, узнятая на невялікую вышыню над агульным узроўнем падлогі. Усярэдзіне яна паўкругам высунутая ў бок малельнай залы. Па цэнтры салеі бліжэй да ўсходняй сцяны мог размяшчацца прастол. Крыніцы XIX – пачатку XX ст. сведчаць, што не ва ўсіх храмах старавераў-беспапоўцаў паўночна-заходняй Беларусі былі прастолы. А доўгі час іх увогуле забаранялася ўстанаўліваць. У адпаведнасці з указам ад 28 красавіка 1836 г. “О воспрещении обращать крестьянские избы в старообрядческие молельни и устраивать в молельнях престолы” старавeрам забаранялася ўсталёўваць у храмах прастолы, якія разглядаліся як элемент выключна праваслаўных (сінадальных) цэркваў. Але пры гэтым указ дазваляў захаваць тыя прастолы, “коих существование дозволено на основании законов” [6, с. 170]. У сучасны перыяд усе стараверскія беспапоўскія храмы рэгіёна маюць прастолы. Як сведчаць сучасныя натурныя абследаванні і ілюстрацыйныя крыніцы,

прастол ўяўляе стол, які ўзвышаецца на пастаменце ў адну ці некалькі прыступак над салеяй. За ім устаноўлены вялікі драўляны крыж. На прастоле размяшчаецца Евангелле і храмавы абраз (у шэрагу выпадкаў абразоў два – яны размяшчаюцца справа і з лева ад прастола на асобных аналоях). Часам на прастол ускладалі і іншыя рэчы (невялікія медныя крыжы і іконы, богаслужбовыя кнігі і г.д.).

Па баках салеі размяшчаюцца два клірасы (“крыласы”, як часта называюць прыхажане) – левы і правы. Клірасы аддзелены ад малельнай залы невысокай перагародкай (глухой ці ў выглядзе рашоткі). На клірасе знаходзяцца ў час богаслужэння святар (“настаўнік”) і “клірашане” (тыя, хто чытаў малітвы і спяваў).

Уся прастора малітоўнай залы падзелена на дзве часткі: “мужчынскую” (правую) і “жаночую” (левую). У ходзе богаслужэння мужчыны і жанчыны моляцца асобна. У большасці храмаў у кожную з гэтых частак вядуць свае дзверы. Для размежавання гэтых частак маглі выкарыстоўваць печку, невялікую перагародку (а часам і на ўсю вышыню залы) ці пастаўленую лаву. У сучасны перыяд такі падзел часта нічым не адзначаны і з’яўляецца ўмоўным. Сама традыцыя раздзельнай малітва мужчын і жанчын вядомая з даўніх часоў, але ў сучасны перыяд у рэгіёне сярод хрысціянскага насельніцтва захоўваецца толькі ў старавераў.

Наверсе над уваходам (уваходамі) у малітоўную залу ў шэрагу цэркваў размяшчаюцца хоры (“форы”). Іх прызначэнне адрозніваецца ад падобнага элемента ў каталіцкіх храмах рэгіёна. У адрозненні ад каталіцкіх храмаў, дзе на хорах размяшчаюцца музыканты і спевакі, прастора хораў у стараверскіх храмах выкарыстоўвалася для знаходжання прыхажанаў.

У малітоўнай зале знаходзяцца лавы, якія, у першую чаргу, прызначаны не для сяджэння, а для выканання зямных паклонаў. Аднак шэраг апісанняў сярэдзіны XX ст. і сучасныя назіранні паказваюць, што ў час богаслужэння лавы часта выкарыстоўваюцца для сяджэння. Аднак, як сведчаць архіўныя матэрыялы, і ў ранейшыя часы ў стараверскіх храмах лавы маглі выкарыстоўвацца каб сядзець. Так, у Мікалаюнцаўскай абшчыне ў канцы 1930-х у пераліку маёмасці храма ўказваліся “лавки кругом стен для сидения” [8, f.1681, ap.1, b.192, l.88r].

Мураваныя храмы ў старавераў рэгіёна не з’яўляюцца пашыранай з’явай. Як ужо было адзначана вышэй, яны пачалі з’яўляцца толькі ў пачатку XX ст. За ўсю гісторыю стараверскага храмабудаўніцтва на тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі толькі адзін культавы аб’ект быў ўзведзены не з дрэва – царква Успення Прасвятой Багародзіцы г.п. Відзы Браслаўскага раёна (пачатак XX ст.; мал. 5). Храм прамавугольны (памер яго амаль 26 метраў у даўжыню і 16 метраў у шырыню) з чырвонай неатынкаванай цэглы. У сучасны перыяд паўднёвая сцяна падтрымліваецца двума бетоннымі контрфорсамі. Такое канструкцыйнае рашэнне абумоўлена той асаблівасцю, што на куце усходняй і паўднёвай сцен ёсць трэшчына, якая была выяўлена яшчэ ў 1925 г. [8, f.1681, ap.1, b.43, l. 111].

У плане і аб’ёме храма вылучаюцца дзве часткі: малітоўная зала і прытвор з вежай-званіцай. Шырыня прытвору большая за шырыню асноўнай часткі храма. А таму ён знешне вылучаецца, выступаючы за перыметр паўночнага і паўднёвага фасадаў своеасаблівымі рызалітамі, завершанымі двухграннымі шчытамі.

Храм накрыты двухсхільным дахам. Да нядаўняга часу большая частка даху была пакрыты шыферам, а невялікая частка з заходняга боку (над прытворам) – бляхай. Аднак у сучасны перыяд гэты невялікі ўчастак пакрылі новым шыферам. У гэтай частцы з-за выступаў-рызалітаў дах мае складаную канструкцыю. Як сведчылі архіўныя матэрыялы, пакрыццё адрамантаванага ў міжваенны перыяд храма павінна было быць з гонту [7, zesp.14, syg.1270, s. 149]. Але, як сведчаць архіўныя матэрыялы, у выніку закупілі бляху.

Над галоўным (заходнім) фасадам узвышаецца трох’ярусная цагляная вежа (васьмярык на двух чаверыках), якая завершана цыбулепадобнай глаўкай. Гэта вежа-званіца вырашана такім чынам, што праразае вільчык (канёк) у заходняй частцы страхі. Другі ярус (чацвярык)

гэтай вежы мае па два арачныя праёмы з кожнага боку. Трэці ж ярус (васьмярык) з усходняга, заходняга, паўночнага і паўднёвага бакоў мае па адным праёме. Над усходняй часткай храма маецца і другая невялікая драўляная глаўка. Яна двух'ярусная (васьмярык на чацвярыку) з шатровым завяршэннем і невялікай цыбулепадобнай глаўкай. Гэта глаўка "глухая" і бакавых праёмаў не мае. У той жа час на плане рэканструкцыі 1925 г. яна мусіла мець аконныя праёмы.



**Малюнак 5. – Свята-Успенскі стараверскі храм у г.п. Відзы Браслаўскага р-на.**
**Фота Аўсейчыка У.Я. у 2023 г.**

Дэкаратыўнымі дэталаямі вылучаецца галоўны (заходні) фасад, які завершаны двухгранным шчытом. На ім аформлены высокі геаметрызаваны партал, які паўтарае форму шчыта. У цэнтры яго – дзвярны праём з лучковым завяршэннем. Над ім лучковая броўка з плечыкамі. Над дзвярмі размяшчаецца невялікая ніша з лучковай броўкай з плечыкамі, якая сваёй формай паўтарае аконныя праёмы. У самым версе шчыта размешчана невялікае паўцыркульнае вакенца для асвятлення лесвіцы на званіцу. Па баках партала маецца па адной нішы, якія паўтараюць форму аконных праёмаў. Кожная з гэтых нішаў аздоблена рэльефнымі васьміканцовымі крыжамі.

Архітэктурную выразнасць пласкасным бакавым фасадам надае рытм лучковых вокнаў і шырокіх лапатак у прасценках, завершаных фігурным карнізам. На кожным з бакавых фасадаў размешчаны па 6 высокіх аконных праёмаў у прафіляваных ліштвах. У пяці з іх устаўлены вокны (першапачаткова з драўлянымі рамамі, а ў сучасны перыяд – пластыкавыя шклопакеты), а адін (у заходняй частцы фасадаў) – замураваны. Над аконнымі праёмамі выступаюць лучковыя броўкі, якія заканчваюцца заплечыкамі. Пад кожным з аконных праёмаў размешчана прамавугольная ніша, якая па шырыні роўная аконнаму праёму.

Заходні, паўночны і паўднёвы фасады храма багата дэкарыраваныя і іншымі відамі фігурнай цаглянай кладкі (вуглавымі лапаткамі, прафіляваным карнізам і г.д.). У сярэдзіне заходняга, паўночнага і паўднёвага фасадаў праходзіць гарызантальны дэкаратыўны паясок

у выглядзе парэбрыка. У сваю чаргу ўсходні фасад у дэкаратыўным плане вельмі сціплы. Яго плошчу падзяляюць дзве шырокія лапаткі на тры роўныя часткі. У верхнім ярусе кожнай з гэтых частак размешчаны рэльефныя васьміканцовыя крыжы. Усходні фасад увенчаны трохвугольным франтонам, на якім няма ніякага дэкаратыўнага аздаблення.

Уваход у маленную размяшчаецца з заходняга боку, з боку галоўнага фасада. Да нядаўняга часу яшчэ адзін уваход размяшчаўся з паўднёвага боку храма. На планах 1920-х гг. яго няма, але на плане будынка 1952 г. ён прысутнічае. Гэты ўваход быў вырашаны шляхам праразання сцяны пад адным з аконных праёмаў. Але ў сучасны перыяд ён замураваны цэглай.

Такім чынам, за працяглы перыяд пражывання на беларускіх землях у стараверскага насельніцтва сфарміравалася ўнікальная культура, якая стала неад’емнай часткай агульнай культурнай спадчыны краіны. З усяго комплексу гісторыка-культурных каштоўнасцей рускіх старавераў асобнае месца займаюць аб’екты храмавага дойлідства. Яны займаюць адметнае месца ў архітэктурным ландшафце шэрагу населеных пунктаў паўночна-заходняй Беларусі. Храмавае дойлідства старавераў рэгіёна вылучаецца свой унікальнасцю. У гэтай частцы культуры спалучаюцца рысы як традыцыйнага народнага дойлідства, так і прафесійнай архітэктуры. Сярод аб’ектаў культавага дойлідства старавераў-беспапоўцаў паўночна-заходняй Беларусі вылучаюцца дзве групы: драўляныя і мураваныя храмы. Абсалютную большасць уяўляюць аб’екты, пабудаваныя з дрэва. Сярод мураваных храмаў да начага часу захаваўся толькі храм у г.п. Відзы Браслаўскага раёна.

ЛІТАРАТУРА

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.
4. Памятная книжка Виленской губернии на 1899 год. – Вильна: Губ. тип., 1898. – XIX, 60, 321, 431 с.
5. Посох, Г. Видзы / Г. Посох. – Ковно: Тип. губ. правл., 1895. – 13 с.
6. Собрание постановлений по части раскола; 2-е изд., испр. и доп. – СПб: Тип. МВД, 1875. – [4], 694, 65 с.
7. Archiwum Akt Nowych.
8. Lietuvos centrinis valstybės archyvas.